**Цікавосткі.** Выстаўку «Зноў у школу», прымеркаваную да Дня ведаў, прапануюць наведвальнікам у Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага. Больш за 100 вырабаў ствараюць школьны свет як праз утылітарныя прадметы, так і з дапамогай разнастайных вобразаў настаўнікаў, вучняў, цікавых сюжэтных кампазіцый, паведамляюць арганізатары. Нацыянальная бібліятэка Беларусі прадстаўляе калекцыю буквароў, па якіх вучыліся беларускія дзеці ў 1900—1990-х гадах. Таксама ўвазе гасцей — бюсты і статуэткі класікаў літаратуры, творы якіх уключаны ў школьную праграму, незвычайная калекцыя сашчэпак з розных краін свету. Выстаўка арганізавана сумесна з НББ, Беларускім дзяржаўным музеем народнай архітэктуры і побыту, калекцыянерамі Віктарам Суворавым і Аляксандрам Лугіным.

**Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ**